***Кацярына Блоцкая***

# МУЗЫЧНА-СТЫЛЯВЫЯ І СТРУКТУРНА-ТЫПАЛАГІЧНЫЯ АСАБЛІВАСЦІ ВУЗКААБ'ЁМНЫХ ВЯСЕЛЬНЫХ НАПЕВАЎ БРЭСЦКАГА ПАЛЕССЯ

Тыпавыя абрадавыя напевы складаюць важнейшую частку песеннай творчасці беларусаў. Ім уласцівы прыродны меладызм, натуральная прастата і выразнасць, арыгінальнасць музычнай мовы, дыятанічнасць ладавай будовы і рэльефнасць дакладнага рытмічнага малюнку [3, с. 7].

У драматургіі вясельнага абраду роля вясельных напеваў аналагічна ролі каляндарных напеваў у гадавым каляндарна-земляробчым цыкле. Згодна народнаму ўспрыманню, яны маюць сімвалічнае значэнне. Як і каляндарныя, вясельныя напевы з'яўляюцца гістарычна-ўстойлівымі і геаграфічна замацаванымі [2, с. 12-14]; [5, с. 9].

Вясельныя напевы Брэсцкага рэгіёна характарызуюцца шматпланавасцю гучання, але навукоўцы вылучаюць сярод іх пэўныя вобразна-эмацыйныя сферы:

рытуальна-прыўзнятую (слаўленне маладых, каравай), лірыка-драматычную (заручыны, зборная субота, здыманне вянка, сіроцкія), апавядальную і жартоўную (пераклічкі сватоў і дружак) [5, с. 10]; [1, с. 51]. Па ўсведамленню ж саміх народных спевакоў, існуе толькі дзве сферы вясельных песень: "вясёлыя" песні (песні святочна-прыўзнятага і жартоўнага характару) і "абідлівыя" ("жаласлівыя") (песні лірыка-драматычнага характару, калі трэба "ўжалабіць" маладую, яе бацькоў ці гасцей) [5, с. 9-10].

На характар гучання вясельных напеваў асабліва ўплываюць інтанацыйныя комплексы, якіх на тэрыторыі Беларусі распаўсюджана чатыры: квінтавы, квартавы, тэрцовы і секундавы; пры гэтым тры апошнія можна аднесці да вузкааб'ёмных. Такія напевы шырока распаўсюджаны на Брэсцкім Палессі. Напевы квартавага інтанацыйнага комплексу бытуюць ва ўсіх рэгіёнах Беларусі, у тым ліку і на Брэстчыне. Тэрцовыя напевы на Заходнім Палессі ўтвараюць астраўныя арэалы. Секундавы інтанацыйны комплекс лакалізаваны ў цэнтральнай частцы Брэсцкага рэгіёна [1, с. 52].

Спецыфічнай адметнасцю музычнага кампанента палескага вяселля з'яўляюцца каравайныя песні. Яны акцэнтуюць найбольш урачыстыя моманты каравайнай цырымоніі. Такія песні вылучаюцца асабліва рэзкім, упэўненым, настойлівым гучаннем і маюць хутчэй мажорную афарбоўку.

Мінорны характар гучання уласцівы песням, звязаным з вобразам маладой. Да такіх песень звычайна адносяцца песні «на вянках», песні для маладой, сірочыя песні [1, с. 57]; [4, с. 186].

Не гледзячы на розныя эмацыянальныя сферы, вясельныя песні Палесся гарманічна спалучаюцца паміж сабой і ўтвараюць унікальны музычна-песенны кампанент традыцыйнга вяселля Брэстчыны.

Тыпалагічна істотнай прыкметай для ўсіх вясельных мелодый выступае структурна-рытмічны комплекс, які аб'ядноўвае структуру верша і рытм яго "музычнага прачытання", утвараючы пэўную рытмічную форму [1, с. 52]. У адпаведнасці з гэтым крытэрыем на тэрыторыі Брэсцкага Палесся вылучаецца сем тыпаў вясельных напеваў, большасць з якіх існуе тут у дзвюх структурна-рытмічных разнавіднасцях: 1) А-І, А-ІІ; 2) Б-І, Б-ІІ; 3) В-І, В-ІІ; 4) Г-І, Г-ІІ; 5) Е-І, Е-ІІ; 6) ВД; 7) Ж-ІІ [1, с. 52]; [5, с. 15-25]. Вузкааб'ёмныя напевы прадстаўлены ў Брэсцкім рэгіёне ўсімі гэтымі тыпамі.

Аналіз структурна-тыпалагічных і музычна-стылявых асаблівасцяў вузкааб'ёмных вясельных напеваў Брэсцкага рэгіёну дазваляе выказаць меркаванне аб іх падабенстве з рытуальна-замоўнымі формуламі. Такое падабенства прасочваецца ў суровай манеры інтаніравання напеваў тыпу Г, а таксама ў мелодыка-інтанацыйнай паўтаральнасці напеваў тыпу Е-І.

Абрадавая лірыка тыпу Г у кожным рэгіёне характарызуецца рознымі музычнымі адценнямі (з-за зменлівасці рытмаінтанацыі, меладычнага і тэмбравага комплексу). На Брэсцкім Палессі меладычны дыяпазон гэтых напеваў звужаны да тэрцовага (з субквартай). Манера інтаніравання тут набывае суровы дэкламацыйны характар [5, с. 20].

Тып Е-І бадай што найбольш наглядна адлюстроўвае песенна-рытуальную сутнасць вяселля Брэсцкага Палесся. Заснаваныя на паўтарэнні адной рытмаінтанацыі, напевы гэтага тыпу маюць у даследуемым рэгіёне прычотна-драматычны характар і гучаць як настойлівыя воклічы. Звернутыя да нявесты, яны падкрэсліваюць кульмінацыйныя моманты вяселля – этапы пераходу дзяўчыны ў "маладзіцы" [5, с. 23].

Ва узаемасувязі інтанацыйнага і рытмічнага комплексаў выяўляецца разнастайнасць дыялектна-стылявога кампаненту вясельных напеваў Брэсцкага рэгіёну. Брэсцкае Палессе – зона, дзе сканцэнтравана значная колькасць тыпавых лакальных напеваў. Тут асабліва праяўляецца тэндэнцыя да вар'іраванасці і разгорнутасці песенных форм вясельных напеваў [1, с. 54].

**Спіс літаратуры:**

1. Беларусы: у 11 т. / рэдкал.: М. Ф. Піліпенка [і інш.]. – Мінск: Беларус. навука, 1995-2009. – Т. 11 : Музыка / А. І. Лакотка [і інш.]. – 2008. – 700 с.
2. Квитка К.В. Избранные труды: в 2 т. / К. В. Квитка. – Москва: Советский композитор, 1971. – Т. 1: Об областях распространения некоторых типов белорусских календарных и свадебных песен. – 384 с.
3. Раговіч, У. І. Песенны фальклор Палесся: у 3 т. / У. І. Раговіч. – Мінск: Чатыры чвэрці, 2001. – Т. 1: Песні святочнага календара. – 527 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

4. Традыцыйная мастацкая культура Беларусі. У 6 т. Т. 4. Брэсцкае Палессе. У 2 кн. Кн. 2 / А. М. Боганева [і інш.]; аўт. ідэі Т. Б. Варфаламеева; агул. рэд. Т. Б. Варфаламеевай. – Мн.: Вышэйш. Шк., 2009. – 559 с.
5. Фядосік, А. С. Вяселле: Мелодыі / А. С. Фядосік, З. Я. Мажэйка, Т. Б. Варфаламеева; под ред. А. С. Фядосіка. – Мінск: Навуа і тэхніка, 1990. – 628 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ